Установа адукацыі
“Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Рэктар БДУКМ
_____ Н.У.Карчэўская
_____ 2026 г.
Рэгістрацыйны № ВД-6/26-144 эвуч.

ТУРЫСТЫЧНЫ ПАТЭНЦЫЯЛ БЕЛАРУСІ

Вучэбная праграма ўстановы адукацыі
па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці
6-05-0322-03 Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны

2026

Вучэбная праграма складзена на аснове адукацыйнага стандарта агульнай вышэйшай адукацыі АСВА 6-05-0322-03-2023 па спецыяльнасці 6-05-0322-03 Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны, зацверджанага пастановай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 21.08.2023 № 274, вучэбных планаў БДУКМ па спецыяльнасці 6-05-0322-03 Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны

СКЛАДАЛЬНІК:

Д.В.Герасімёнак, загадчык кафедры гісторыка-культурнай спадчыны ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў", кандыдат культуралогіі

РЭЦЭНЗЕНТЫ:

Ю.В.Кавалёва, вучоны сакратар дзяржаўнай установы "Музей гісторыі горада Мінска", кандыдат культуралогіі;

С.А.Пацыенка, дацэнт кафедры менеджменту сацыяльна-культурнай дзейнасці ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў", кандыдат культуралогіі

РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:

кафедрай гісторыка-культурнай спадчыны ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў" (пратакол № 9 ад 18.04.2026);
прэзідыумам навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў" (пратакол № 6 ад 24.06.2026)

ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Модуль "Тэорыя, гісторыя і арганізацыя турызму" складаецца з вучэбных дысцыплін "Геаграфія турызму", "Гісторыя і арганізацыя турызму", "Турыстычны патэнцыял Беларусі", "Тэорыя турызму", "Менеджмент і маркетынг у турызме", "Тураперэйтынг" і "Эканоміка турызму". Дадзеная вучэбная праграма прызначана для вывучэння вучэбнай дысцыпліны "Турыстычны патэнцыял Беларусі".

Актуальнасць вывучэння вучэбнай дысцыпліны "Турыстычны патэнцыял Беларусі" абумоўлена тым, што нацыянальны турызм паступова становіцца адной з ключавых галін для стварэння новых працоўных месцаў, эканамічнага росту і прыцягнення інвестыцый. Сістэмныя веды, атрыманыя падчас вывучэння вучэбнай дысцыпліны, неабходны ў практычнай дзейнасці менеджараў на прадпрыемствах турыстычнай індустрыі, спрыяюць фарміраванню і развіццю ведаў і навыкаў па стварэнні сучаснага канкурэнтаздольнага турыстычнага прадукту; выяўленню рэгіянальных асаблівасцей функцыянавання айчыннага турызму.

Асноўныя *мэты* вывучэння вучэбнай дысцыпліны "Турыстычны патэнцыял Беларусі": сфарміраваць у студэнтаў уяўленне аб асноўных заканамернасцях прасторавай арганізацыі турызму, даць веды пра спецыфіку развіцця турыстычных рэгіёнаў і асобных відаў турызму на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь.

Задачы вывучэння вучэбнай дысцыпліны "Турыстычны патэнцыял Беларусі":

– даць студэнтам сістэмныя веды аб рэкрэацыйных рэсурсах Рэспублікі Беларусь;

– навучыць студэнтаў арыентавацца ў спецыялізацыі турыстычных цэнтраў краіны.

У адпаведнасці з адукацыйным стандартам вышэйшай адукацыі па спецыяльнасці 6-05-0322-03 Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны асноўнымі мэтамі прафесійнай падрыхтоўкі студэнтаў выступаюць фарміраванне і развіццё кампетэнцый, заснаваных на гуманітарных ведах, эмацыянальна-каштоўнасным і сацыяльна-творчым вопыце, якія забяспечваюць рашэнне і выкананне грамадзянскіх, сацыяльна-прафесійных, асобасных задач і функцый.

Зместам вучэбнай дысцыпліны прадугледжана фарміраванне наступных кампетэнцый у адпаведнасці з вучэбным планам па спецыяльнасці 6-05-0322-03 Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны: аналізаваць сучасны стан музейных устаноў Беларусі і замежжа, ацэньваць

перспектывы іх далейшага развіцця, у тым ліку ў сувязі з суб'ектамі турыстычнай індустрыі; ствараць інавацыйныя культурныя праекты, укараняць і ацэньваць іх вынікі, распрацоўваць і выкарыстоўваць інавацыйныя тэхналогіі ў музейнай і турыстычнай індустрыі.

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны "Турыстычны патэнцыял Беларусі" студэнты павінны *ведаць*:

– структуру і асаблівасці гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі;

– культурна-гістарычны патэнцыял асноўных турысцка-экскурсійных цэнтраў Беларусі;

– структуру і асаблівасці рэкрэацыйна-рэсурснага патэнцыялу рэспублікі;

умець:

– прымяняць атрыманыя веды для рашэння канкрэтных прафесійных задач;

– аналізаваць канкурэнтаздольнасць турыстычнага і экскурсійнага патэнцыялу Беларусі;

– прагназаваць перспектывы турыстычнага патэнцыялу;

валодаць навыкамі:

– вызначэння турыстычнага патэнцыялу рэгіёнаў Беларусі;

– выкарыстання разнастайных рэкрэацыйных рэсурсаў Беларусі.

У ходзе адукацыйнага працэсу па вучэбнай дысцыпліне студэнт павінен набыць не толькі тэарэтычныя і практычныя веды, уменні і навыкі па спецыяльнасці, але і развіць асабісты каштоўнасны, духоўны патэнцыял, сфарміраваць якасці патрыёта і грамадзяніна, які гатовы да актыўнага ўдзелу ў сацыяльна-культурным жыцці краіны.

Вучэбная праграма па вучэбнай дысцыпліне "Турыстычны патэнцыял Беларусі" распрацавана з улікам пастаўленых задач, узгоднена з праграмамі вучэбных дысцыплін "Тэорыя турызму", "Гісторыя і арганізацыя турызму", "Геаграфія турызму", "Ахова гісторыка-культурнай спадчыны" і іншымі вучэбнымі дысцыплінамі, якія служаць падмуркам у набыцці прафесійных ведаў па спецыяльнасці "Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны".

Да эфектыўных педагагічных методык і тэхналогій, якія мэтазгодна выкарыстоўваць пры выкладанні вучэбнай дысцыпліны, адносяцца: гісторыка-тэматычны падыход; тэхналогіі вучэбна-даследчай дзейнасці; камунікатыўныя тэхналогіі; метад аналізу канкрэтных сітуацый.

Для кіравання вучэбным працэсам і арганізацыі кантрольна-ацэначнай дзейнасці выкладчыкам рэкамендуецца выкарыстоўваць разнастайныя варыянты самастойнай работы, вучэбна-метадычныя комплексы. Для

правядзення семінарскіх заняткаў варта выкарыстоўваць методыкі актыўнага навучання, метад малых груп, дыскусійныя формы.

У адпаведнасці з вучэбным планам, на вывучэнне вучэбнай дысцыпліны "Турыстычны патэнцыял Беларусі" усяго прадугледжана 136 гадзін, з іх 68 – аўдыторныя заняткі. Прыкладнае размеркаванне аўдыторных гадзін па відах заняткаў: лекцыі – 40 гадзін, семінарскія заняткі – 28 гадзін.

Форма правядзення бягучай атэстацыі – вуснае апытанне, тэсціраванне. Рэкамендаваная форма кантролю ведаў студэнтаў – экзамен.

ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

Уводзіны

Прадмет, змест і задачы вучэбнай дысцыпліны "Турыстычны патэнцыял Беларусі". Асноўны паняційна-тэрміналагічны апарат. Месца вучэбнай дысцыпліны ў сістэме гуманітарных ведаў.

Тэма 1. Асноўныя геаграфічныя і прыродныя характарыстыкі Рэспублікі Беларусь

Агульныя звесткі аб краіне. Асаблівасці рэкрэацыйна-геаграфічнага становішча Беларусі. Фізіка-геаграфічная характарыстыка Беларусі. Асаблівасці рэльефу краіны, іх уплыў на развіццё розных формаў турызму. Фактары фарміравання клімату Беларусі. Характарыстыка водных рэсурсаў краіны, флоры і фаўны.

Тэма 2. Дэмаграфічнае і сацыяльна-эканамічнае асяроддзе развіцця турызму ў Беларусі

Дэмаграфічная характарыстыка Беларусі. Сістэма гарадскога і сельскага рассялення. Буйныя, сярэднія і малыя гарады як аб'екты турызму. Сацыяльна-эканамічнае асяроддзе развіцця турызму ў Беларусі. Узровень даходаў і якасць жыцця насельніцтва.

Тэма 3. Асаблівасці развіцця турысцкай інфраструктуры Беларусі

Агульная характарыстыка сучаснага стану развіцця турысцкай інфраструктуры Беларусі і напрамкаў яе ўдасканалення. Характарыстыка гасцінічнай гаспадаркі Беларусі, сферы грамадскага харчавання, індустрыі забаўлення і інш.

Тэма 4. Санаторна-курортная гаспадарка Беларусі

Лячэбныя рэкрэацыйныя рэсурсы: кліматычныя і ландшафтныя фактары, мінеральныя воды, лячэбныя гразі. Характарыстыка асноўных элементаў лячэбнага рэкрэацыйнага патэнцыялу Беларусі. Санаторна-курортная гаспадарка краіны.

Тэма 5. Лячэбна-аздараўленчы і актыўны турызм у Беларусі

Характарыстыка рэкрэацыйна-рэсурснага патэнцыялу развіцця лячэбна-аздараўленчага турызму ў Беларусі: ацэнка клімату, рэльефу, водных аб'ектаў і інш. Асноўныя формы лячэбна-аздараўленчага турызму і іх тэрытарыяльная

арганізацыя. Асаблівасці развіцця актыўнага турызму ў Беларусі. Спартыўныя цэнтры краіны.

Тэма 6. Экалагічны, аграэкалагічны і паляўнічы турызм у Беларусі

Рэсурсны патэнцыял экалагічнага турызму ў Беларусі. Фонд асабліва ахоўных тэрыторый краіны. Сучасныя асаблівасці развіцця экалагічнага турызму ў Беларусі. Асноўныя формы і фактары развіцця аграэкалагічнага турызму ў Беларусі. Аграгурыстычныя сядзібы.

Рэсурсны патэнцыял развіцця паляўнічага турызму ў Беларусі. Відавы склад паляўнічай фауны, дынаміка колькасці звяроў і птушак, на якіх дазволена паляванне. Умовы арганізацыі палявання. Праблемы і перспектывы развіцця паляўнічага турызму на тэрыторыі краіны.

Тэма 7. Развіццё гісторыка-культурнага турызму ў Беларусі

Кароткая характарыстыка гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі. Экскурсійны патэнцыял асноўных турыстычных цэнтраў краіны. Гісторыка-культурныя аб'екты Беларусі, уключаныя ў Спіс Сусветнай спадчыны ЮНЕСКА. Роля музеяў Беларусі ў арганізацыі турысцка-экскурсійнага абслугоўвання. Сучасныя асаблівасці развіцця гісторыка-культурнага турызму.

Тэма 8. Іншыя віды турызму на тэрыторыі Беларусі

Падзейны турызм у Беларусі. Асноўныя цэнтры падзейнага турызму. Рэлігійны турызм. Цэнтры паломніцтва на тэрыторыі краіны. Прамысловы турызм. Туры ў Палескі дзяржаўны радыяцыйна-экалагічны запаведнік як новая разнавіднасць турызму.

Тэма 9. Асаблівасці развіцця міжнароднага турызму ў Беларусі

Фактары развіцця міжнароднага турызму ў Беларусі. Канкурэнтаздольнасць турыстычнага комплексу краіны. Дынаміка і рэгіянальная структура турыстычных патокаў. Асноўныя віды міжнароднага турызму. Дзелавы турызм.

Тэма 10. Турысцкая палітыка Рэспублікі Беларусь

Сістэма кіравання турысцкім комплексам Рэспублікі Беларусь. Структура і функцыі Нацыянальнага агенцтва па турызму. Прыярытэтныя напрамкі дзяржаўнай палітыкі ў сферы турызму. Дзяржаўныя праграмы развіцця турызму ў Рэспубліцы Беларусь.

Тэма 11. Турыстычны патэнцыял рэгіёнаў Беларусі

Характарыстыка турыстычнага патэнцыялу рэгіёнаў Беларусі: асаблівасці рэкрэацыйна-геаграфічнага становішча, прыродныя і гісторыка-культурныя рэсурсы развіцця турызму, турысцкая інфраструктура. Асаблівасці арганізацыі асноўных відаў турызму ў рэгіёнах. Праблемы і перспектывы развіцця рэгіянальнага турызму.

ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ

Нумар раздзела, тэмы	Назва раздзела, тэмы	Колькасць аўдыторных гадзін		Колькасць гадзін КСР	Форма кантролю ведаў
		Лекцыі	Семінарскія заняткі		
1	2	3	4	5	6
	Уводзіны	0,5			
1.	Асноўныя геаграфічныя і прыродныя характарыстыкі Рэспублікі Беларусь	1,5			
2.	Дэмаграфічнае і сацыяльна-эканамічнае асяроддзе развіцця турызму ў Беларусі	2			
3.	Асаблівасці развіцця турысцкай інфраструктуры Беларусі	2			
4.	Санаторна-курортная гаспадарка Беларусі	2			
5.	Лячэбна-аздараўленчы і актыўны турызм у Беларусі	2	2		
6.	Экалагічны, аграэкалагічны і паляўнічы турызм у Беларусі	2	2		
7.	Развіццё гісторыка-культурнага турызму ў Беларусі	2	2		
8.	Іншыя віды турызму на тэрыторыі Беларусі	2	2		
9.	Асаблівасці развіцця міжнароднага турызму ў Беларусі	2	2		
10.	Турысцкая палітыка Рэспублікі Беларусь	2		2	выбарачнае апытанне, тэставае заданне, мультымедыя прэзентацыя

1	2	3	4	5	6
11.	Турыстычны патэнцыял рэгіёнаў Беларусі	12	12	12	выбарачнае апытанне, тэставае заданне, мультымедыя прэзентацыя
Разам		**32**	**22**	**14**	

ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

Літаратура

Асноўная

1. Локотко, А. И. Маршруты белорусского туризма : историко-культурные ландшафты Беларуси / А. И. Локотко. – Минск : Беларуская навука, 2018. – 321 с. : ил. – Режим доступа: по подписке. – URL: https://biblioclub.ru/index.php?page=book&id=498775 (дата обращения: 15.05.2026). – Библиогр. в кн. – Текст : электронный.

2. Самусік, А. Ф. Помнікі гісторыі і культуры Беларусі : вучэбны дапаможнік для студэнтаў вну па спецыяльнасці "Эканоміка і кіраванне турысцкай індустрыяй". – Мінск : Экоперспектива, 2013. – 366 с.

Дадатковая

1. Беларусь туристическая = Belarus touristic / [авт. текста и сост.: Н. А. Чирский, Е. Н. Чирский]. – Минск : Беларусь, 2017. – 335 с.

2. Локотко, А. И. Туристическая мозаика Беларуси / А. И. Локотко, О. Н. Князева, Е. В. Морозов. – Минск : Белорусская наука, 2011. – 640 с. – URL: https://biblioclub.ru/index.php?page=book&id=86732 (дата обращения: 15.05.2026).

3. Туризм // Национальный статистический комитет Республики Беларусь. – URL: https://www.belstat.gov.by/ofitsialnaya-statistika/realny-sector-ekonomiki/turizm/ (дата обращения: 15.05.2026).

Пералік рэкамендуемых сродкаў дыягностыкі вынікаў вучэбнай дзейнасці студэнтаў

Арганізацыя вучэбнай работы студэнтаў накіравана на засваенне лекцыйнага матэрыялу, а таксама на самастойны пошук і падрыхтоўку інфармацыйных матэрыялаў да семінарскіх заняткаў па вучэбнай дысцыпліне "Турыстычны патэнцыял Беларусі".

Для дыягностыкі атрыманых студэнтамі ведаў прадугледжваецца выкарыстанне наступных сродкаў:

- тэставыя заданні па асобных падраздзелах і вучэбнай дысцыпліне ў цэлым;
- пісьмовыя работы па асобных падраздзелах вучэбнай дысцыпліны;
- мультымедыя прэзентацыі па асобных падраздзелах вучэбнай дысцыпліны;
- выступленні студэнтаў на семінарскіх занятках па самастойна падрыхтаваных тэмах.

Выніковая ацэнка вынікаў вучэбнай дзейнасці прадугледжвае правядзенне экзамену.

Метадычныя рэкамендацыі па арганізацыі і выкананні самастойнай работы студэнтаў

Арганізацыя самастойнай работы студэнтаў прадугледжвае падрыхтоўку студэнтамі інфармацыйных матэрыялаў на адпаведную тэматыку, мультымедыя прэзентацый па асобных тэмах вучэбнай дысцыпліны "Турыстычны патэнцыял Беларусі", вывучэння дадатковых крыніц і літаратуры, падрыхтоўку да экзамену.

Самастойная работа студэнтаў накіравана на:

- фарміраванне навыкаў пошуку і аналізу розных відаў інфармацыі;
- засваенне, сістэматызацыю і трансляцыю атрыманых ведаў у будучай прафесійнай дзейнасці;
- развіццё дадатковых навукова-даследчых навыкаў.

Кантроль за выкананнем самастойнай работы з'яўляецца бягучым і рэалізуецца праз электронную пошту, індывідуальныя кансультацыі, падчас лекцыйных і семінарскіх заняткаў, а таксама падчас правядзення экзамену.

Характарыстыка рэкамендуемых метадаў выкладання

Пры арганізацыі выкладання вучэбнай дысцыпліны "Турыстычны патэнцыял Беларусі" рэкамендуецца выкарыстоўваць традыцыйныя формы і метады навучання студэнтаў: лекцыйныя і семінарскія заняткі, а таксама элементы самастойнай работы.

У лік эфектыўных педагагічных тэхналогій, якія спрыяюць развіццю ў студэнтаў крытычнага мыслення, вопыту фарміравання і выкарыстання інструментарыя вучэбна-даследчай дзейнасці, ролевага і імітацыйнага мадэлявання, магчымасці творча засвойваць новы вопыт, вылучаюцца тэхналогіі: праблемнага навучання; кантэнт-аналізу; праектнага навучання; камунікацыйныя і інфармацыйныя тэхналогіі; тэхналогіі вучэбна-даследчай дзейнасці; метад аналізу канкрэтных сітуацый; іншыя інавацыйныя і інтэрактыўныя методыкі.